**АГЕЕЎ**
**Аляксандр Рыгоравіч,**
*дацэнт Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А.Куляшова*

# "Непатрыятычныя думкі" для "патрыятычнай канферэнцыі"

Друкаваць гэты тэкст на старонках "Магілёўскай даўніны", шчыра кажучы, у мяне не было вялікага жадання. Бо, па-першае, прызначаўся ён для чытання на канферэнцыі, таму мае ўсе стылевыя прыкметы выступлення, а не артыкула. Тэкст, напісаны спецыяльна для часопіса, безумоўна, страціў бы многія элементы публіцыстычнасці і палемічнай вастрыні, уласцівыя "жывому" слову. А па-другое, некаторыя меркаванні аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны пры друкаванні ў навукова-папулярным выданні патрабуюць больш сур'ёзнай аргументацыі і дадатковых даследаванняў. Па гэтай жа прычыне, калі арганізатары канферэнцыі "Патрыятычнае выхаванне дзяцей, падлеткаў і моладзі" азнаёмілі мяне з "пэўнымі заўвагамі" да тэзісаў майго выступлення, я прапанаваў ім проста не друкаваць іх у інфармацыйна-метадычным зборніку, які рыхтаваўся да яе адкрыцця. Замест гэтага прапанаваны тэкст "парэзалі" такім чынам, што істотна сказілася як яго танальнасць, так і змест. Але нават не згаданая рэдакцыйная "праўка" падштурхнула да гэтай публікацыі, а тое, што



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не варты асаблівай увагі канфлікт яскрава паказаў, якія менавіта думкі здаюцца няправільнымі, непатрыятычнымі, а часам і небяспечнымі сучаснай беларускай наменклатуры... І апошняя заўвага: на мой погляд, "прычэсванне" і скажэнне гістарычнай праўды, "квасны" патрыятызм, які замоўчвае і адкідвае ўсе негатыўныя, неадназначныя бакі гістарычнага працэсу, на самой справе, і з'яўляецца ілжэпатрыятызмам. Першы варыянт тэзісаў выступлення без выняткаў і рэдагавання, як здаецца, дапаможа чытачу самому разабрацца ў сутнасці праблемы.

## З практыкі работы этнаграфічнага гуртка Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта па патрыятычным выхаванні моладзі

*У першыя гады пасля распаду СССР стала нямодна называць сябе патрыётам. Амаль аксіяматычнай стала фраза: "Патрыятызм— апошні прытулак нягоднікаў". І тым не менш, ідэі патрыятызму не зніклі, паступова ўмацаваліся і зараз зноў набылі папулярнасць. Сёння большасць палітыкаў з павагай ставіцца да патрыятычных рухаў. Праўда, ідэі патрыятызму розныя палітычныя плыні разумеюць па-рознаму, часам амаль супрацьлегла. І тым не менш, і беларускія "нацыяналісты", якія супрацьстаяць расійскім "нацыянал-фашыстам", і вялікадзяржаўныя "патрыёты", якія аблайваюць "сепаратыстаў", прызнаюць, што ў аснове патрыятызму ляжыць любоў і павага да Бацькаўшчыны.*

*Сёння, на вялікі жаль, многія маладыя людзі не любяць "гэтую краіну", імкнуцца з'ехаць у больш багатыя, добраўпарадкаваныя дзяржавы. Ні сям'я, ні школа, ні ўвогуле грамадства не змаглі навучыць іх любіць сваю Радзіму, а значыць і імкнуцца зрабіць сённяшняе жыццё ў ёй лепшым. Маладыя "манкурты", якія не ведаюць сваіх каранёў і не разумеюць унікальнай самабытнасці культуры свайго народа, не берагуць нацыянальныя здабыткі, прыроду роднага краю, грамадскую і прыватную ўласнасць, паводзяць сябе часцяком амаральна... Таму натуральна, што зараз дзяржаўная ўлада пачала зноў паварочвацца да праблем патрыятычнага выхавання моладзі.*

Ужо некалькі гадоў на гістарычным факультэце МДУ існуе студэнцкі навукова-даследчы этнаграфічны гурток. Работа гуртка актывізавалася ў сувязі з прыняццем рашэння аб стварэнні ва універсітэце вучэбнага этнаграфічнага музея. З мэтай назапашвання экспанатаў для экспазіцыі музея былі арганізаваны экспедыцыі ў Бялыніцкі, Дрыбінскі, Магілёўскі, Чавускі раёны Магілёўскай вобласці. Сабраная студэнтамі гістфака і філфака калекцыя рэчаў народнага побыту XIX — пач. XX стст. дазволіла літаральна за год стварыць экспазіцыю і адкрыць музей. Фінансавую падтрымку музею аказала дзяржаўная гісторыка-культурная экспедыцыя па захаванню помнікаў гісторыі і культуры ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Асноўнымі задачамі гуртка першапачаткова з'яўляліся вучэбныя, навукова-даследчыя і прыкладныя (стварэнне музея). Але адразу ж высветлілася, што праца гуртка мае вялікі выхаваўчы ўплыў на студэнтаў. Экспедыцыі, экскурсіі, сустрэчы з краязнаўцамі, пошукавая і даследчая работа спрыялі патрыятычнаму выхаванню як ускосна, так і непасрэдна. Знаёмства з прыродай роднага краю, побытам жыхароў сучаснай беларускай вёскі і цяжкімі ўмовамі жыцця нашых продкаў (праз знаёмства з старадаўнімі рэчамі і тэхналогіяй іх вырабу) спрыяла ўзнікненню любові да прыроды, да традыцый свайго народа. Яе выхаванне, на наш погляд, з'яўляецца адной з задач патрыятычнага выхавання.

З цягам часу стала зразумела, што работа гуртка з'яўляецца эфектыўнай формай і ваенна-патрыятычнага выхавання. Студэнты, якія праводзілі этнаграфічныя даследаванні, пастаянна вялі размовы з жыхарамі вёсак пра Вялікую Айчынную вайну. Для высвятлення перспектыўнасці вёсак на этнаграфічны матэрыял, часу стварэння рэчаў неабходна было ведаць, ці не паліліся вёскі ў гады вайны, высяляліся ці не іх жыхары падчас блакадаў, або з-за блізкасці фронту і г.д. Такія размовы дапамагалі ўсталёўваць кантакт з тутэйшым насельніцтвам, спрыялі выкананню даследчых задач і непасрэдна знаёмілі студэнтаў з гісторыяй нядаўняга мінулага.

Таму ўжо да другой экспедыцыі была падрыхтавана анкета, якая ўтрымоўвала 21 пытанне аб розных баках штодзённага жыцця мірнага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Апытваліся людзі сталага ўзросту, якім у тыя гады было не менш за 7 гадоў. Усяго было апытана каля 70-ці чалавек, і рабіць поўныя вывады на такой колькасці рэспандэнтаў нельга. Тым больш, што не былі ахоплены розныя рэгіёны Магілёўскай вобласці. І тым не менш, на наш погляд, *ужо можна казаць аб першых выніках анкетавання.*

*Адразу кідаецца на вочы, што "кніжная" вайна, аб якой распавядалі за савецкім часам настаўнікі на ўроках, пісалі ў кніжках, і сапраўдная вайна — гэта шмат у чым розныя рэчы. Сучасная гістарычная навука ўжо пачала адыходзіць ад двухмернасці апісання гэтай вайны. Анкетаванне цалкам пацвердзіла шматмернасць рэчаіснасці.*

*Адказы на пытанні паказваюць, што нямецкія салдаты па-рознаму паводзілі сябе ў беларускіх вёсках. Апытаныя часта ўспаміналі прыклады рабавання вёсак, угону мясцовага насельніцтва на працу ў Германію і г.д. Але амаль кожная другая анкета ўказвае і на факты дапамогі нямецкіх салдат тутэйшаму насельніцтву, асабліва харчаваннем дзецям. Часта падкрэсліваецца, што немцы былі "і добрыя, і злыя". Сваіх паліцаяў часцяком баяліся болей за немцаў. Сапраўды трэба прызнаць, што былі нямецкія салдаты, якія выконвалі загады свайго камандавання, а былі сярод іх і фашысты, якія са звярынай асалодай учынялі злачынствы супраць мірнага насельніцтва. Нават ва ўмовах вайны салдат мае, хаця і абмежаваную, магчымасць выбару, часта выбару паміж зверам і чалавекам.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Адказы на пытанні не дазваляюць пацвердзіць і ўсенародную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Хутчэй можна казаць аб тым, што гераізм беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны заключаўся ў тым, што ён у тых надзвычай цяжкіх умовах змог выжыць, захаваць сябе і вылучыць актыўную частку, якая ўдзельнічала ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. А тэзіс "аб усенароднай барацьбе" лёгка абвяргаецца самой партызанскай статыстыкай. Нават яе завышаныя лічбы гавораць, што партызаны і падпольшчыкі складалі не больш за 1/20 частку насельніцтва.*

*Безумоўна і тое, што партызанскі рух быў звыш меры гераізаваны. Большасць апытаных рэспандэнтаў з павагай адносіліся да партызан і тым не менш падкрэслівалі, што былі "партызаны", а былі і "бандыты", якія часам забіралі апошняе ў сялян, не столькі змагаліся з ворагам, колькі адседжваліся ў лясах. Нездарма на пытанне "Каго больш баяліся ў гады акупацыі?" — ледзь не палова адказала: "І тых і другіх", або "Днём немцаў, а ноччу партызан".*

*Такім чынам, практыка дзейнасці этнаграфічнага гуртка МДУ паказвае вялікія магчымасці гуртковай работы па патрыятычным выхаванні моладзі. Анкетаванне, праведзеная праца па вывучэнні побыту мірных жыхароў у гады Вялікай Айчыннай вайны разбураюць некаторыя ўсталяваныя стэрэатыпы, дазваляюць больш глыбока ўбачыць праўду вайны, трагізм становішча беларускага народа. Але ўзнікае пытанне, ці трэба гэтую праўду "ліць на галавы" маладым людзям? Ці здольны яны ўспрымаць яе і не стануць цынікамі? Агульны адказ — трэба! Але з улікам узроставых асаблівасцей. У малодшым школьным узросце на ўроках "Беларусь — мая Радзіма" і на ўроках гісторыі ў базавай школе падыход можа быць спрошчаны. Спачатку трэба даць навучэнцу асноўныя веды і сфарміраваць галоўныя прычына-выніковыя сувязі і паняцці. А вось у старэйшых класах і ВНУ, як паказвае наш вопыт выкладання ў абласным педагагічным ліцэі і універсітэце, — гэта нават неабходна. Праз успаміны прадстаўнікоў старэйшага пакалення і асобныя публікацыі праўдзівая інфармацыя аб вайне ўсё роўна даходзіць да маладых людзей. А яе адсутнасць у падручніках выклікае агульны недавер да тэкстаў. Веданне ж супярэчлівасці і неадназначнасці ваеннай сітуацыі не разбурае асноўны каркас ведаў аб вайне. Агрэсар застаецца агрэсарам, а антычалавечная сутнасць палітыкі "нацы" становіцца яшчэ больш відавочнай. Кошт перамогі ўзрастае, але яна ад гэтага не становіцца менш значнай.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова